# Гісторыя

У. К. КОРШУК

## ПОДЗВІГ НАРОДА

**(Да 45-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне)**

Чым далей у глыб гісторыі адыходзяць цяжкія і гераічныя гады Вялікай Айчыннай вайны, тым больш рэльефна, маштабна і ярка раскрываецца перад чалавецтвам веліч подзвігу савецкага народа і яго Узброеных Сіл, якія ўнеслі рашаючы ўклад у справу разгрому фашысцкіх агрэсараў, адстаялі свабоду і незалежнасць Радзімы.

Праўдзівае асвятленне гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, яе вынікаў і ўрокаў садзейнічае выхаванню шырокіх мас у духу гераічных традыцый нашага народа, дае магчымасць новым пакаленням, якія выраслі ва ўмовах міру, пазнаць суровую праўду аб вайне, якую некаторыя спрабуюць сказіць, даказаць, што мінулая вайна не такая слаўная і гераічная. Так, былі пралікі, неапраўданыя страты, памылкі камандавання, вялікая віна Сталіна. Але подзвіг народа быў і была Перамога. Вайна выявіла нябачную стойкасць савецкіх людзей, іх патрыятызм, мужнасць і масавы гераізм. Галоўным творцам Вялікай Перамогі з'явіўся савецкі народ, які здзейсніў подзвіг, якога яшчэ не ведала гісторыя.

Перамога над агрэсіўнымі сіламі імперыялізму, над фашызмам і японскім мілітарызмам прадвызначыла ўвесь ход далейшага сусветнага развіцця. Яна з'явілася магутным паскаральнікам сусветнага рэвалюцыйнага працэсу, стварыла дабратворныя ўмовы для сацыялістычных рэвалюцый у шэрагу краін, стала магутным стымулам развіцця класавай барацьбы ў краінах капіталу, бурнага росту нацыянальна-вызваленчага руху, які прывёў да крушэння сістэмы каланіялізму. Усё гэта абумовіла карэнныя змяненні ў суадносінах сіл на міжнароднай арэне на карысць сацыялізму, міру на зямлі.

Перамога над фашызмам далася нялёгка. Для яе дасягнення спатрэбіліся вялікія намаганні ўзброеных сіл, іх спалучэнне з эканамічнымі, дыпламатычнымі, ідэалагічнымі і іншымі сродкамі барацьбы.

Разгром фашызму быў перш за ўсё ваеннай перамогай. У ходзе вайны былі знішчаны ўзброеныя сілы, уся ваенная машына агрэсіўных фашысцкіх дзяржаў. Рашаючую ролю ў гэтым адыграў Савецкі Саюз, савецкі народ, які на сваіх плячах вынес асноўны цяжар барацьбы з фашызмам. Ужо ў грозным 1941 годзе Чырвоная Армія зрабіла рэальнасцю, здавалася б, немагчымае: яна затрымала фашысцкі вермахт на яго беспярашкодным шляху да сусветнага панавання. Моцная стратэгічная групоўка гітлераўскай арміі была разбіта на подступах да сталіцы СССР. Гэта было першае стратэгічнае паражэнне ўзброеных сіл фашысцкай Германіі ў другой сусветнай вайне, у выніку якога быў страчаны раздуты нацысцкай прапагандай арэол непераможнасці гітлераўскага вермахта. Прыгранічныя бітвы ў Прыбалтыцы, Беларусі і на Украіне, Смаленская бітва, бітва пад Масквой, гераічная абарона Ленінграда і Кіева сталі асноўнымі ступенямі крушэння фашысцкай дактрыны «маланкавай вайны».

У грандыёзных па маштабу бітвах пад Сталінградам, пад Курскам і на Дняпры Савецкая Армія дабілася карэннага пералому ў ходзе Вялікай Айчыннай вайны і ўсёй сусветнай вайны, які прадвызначыў змяненне агуль-

ных суадносін сіл і забяспечыў пераход стратэгічнай ініцыятывы ў рукі антыгітлераўскай кааліцыі.

Завяршыўшы і замацаваўшы карэнны перавалом, Савецкая Армія ажыццявіла масавае выгнанне ворага з межаў СССР, нанесла яму незваротныя страты і ў сакавіку 1944 года выйшла на Дзяржаўную граніцу на поўдні краіны. Тым самым была аблегчана барацьба на іншых тэатрах ваенных дзеянняў і паскорана заканчэнне вайны.

Савецкі народ сваёй гераічнай барацьбой аказаў непасрэдную дапамогу народам іншых краін у пазбаўленні ад фашызму. Уласна кажучы, уся другая сусветная вайна для Савецкага Саюза аказалася не толькі Вялікай Айчыннай, але і вайной за свабоду іншых краін, за выратаванне чалавечай цывілізацыі.

Гераічная барацьба народа Савецкага Саюза клікала і натхняла народы зняволеных краін на актыўныя дзеянні супраць акупантаў. Да лета 1944 года ў народна-вызваленчай вайне Югаславіі, якая пачалася пасля нападзення Германіі на СССР, а таксама ў руху Супраціўлення Польшчы, Чэхаславакіі, Грэцыі, Францыі, Балгарыі і Італіі ўдзельнічала больш 2,2 млн. чалавек. Галоўнай формай супраціўлення фашызму станавілася ўзброеная барацьба.

Дапамога Савецкага Саюза народам замежных краін у барацьбе з фашызмам мела самы разнастайны характар. На тэрыторыі Савецкага Саюза і пры яго актыўнай, усебаковай падтрымцы фарміраваліся нацыянальныя часці і злучэнні Польшчы, Чэхаславакіі, Румыніі. Пачаў свой баявы шлях у савецкім небе і гераічна змагаўся французскі полк «Нармандыя-Нёман». Агульная колькасць нацыянальных фарміраванняў к канцу вайны дасягнула 555 тыс. чалавек. Тысячы самалёта-вылетаў зрабіла савецкая авіяцыя ў Югаславію, даставіўшы народна-вызваленчай арміі вялікую колькасць розных грузаў. Сур'ёзную дапамогу баявой тэхнікай і іншымі матэрыяламі аказаў Савецкі Саюз барацьбітам супраць фашызму ў Албаніі, Грэцыі, Венгрыі і іншых краінах. Важнае значэнне ў разгортванні вызваленчай барацьбы мелі рэйды савецкіх партызанскіх злучэнняў у Польшчу і Чэхаславакію.

Выгнаўшы нямецка-фашысцкіх захопнікаў з роднай зямлі, савецкія людзі працягнулі руку дапамогі народам іншых краін, якія знаходзіліся пад прыгнётам акупантаў. Гэта інтэрнацыянальная місія на тэрыторыі дзяржаў Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы працягвалася больш года і каштавала савецкаму народу вельмі дорага — больш мільёна жыццяў нашых воінаў.

Уступленне Чырвонай Арміі на тэрыторыі замежных краін з'явілася сапраўдным святам для мільёнаў людзей. Рабочыя і сяляне, людзі розных нацыянальнасцей і сацыяльнага становішча з захапленнем сустракалі сваіх вызваліцеляў. У памяці народаў не сціраецца светлы вобраз савецкага салдата, салдата-гуманіста, патрыёта, інтэрнацыяналіста. Вось чаму ўсюды, дзе пралягаў яго баявы шлях,— ад паўвострава Рыбачага да Балканскіх гор — узведзены помнікі і абеліскі, імёнамі савецкіх герояў названы гарады, вуліцы і плошчы. Працоўныя вызваленых краін Еўропы ўдзячны Савецкай Арміі за тое, што, разбіўшы фашысцкія орды, яна стварыла ўмовы, у якіх народныя масы маглі самі вырашаць лёс сваіх дзяржаў.

Вось радкі са звароту галоўнага штаба балгарскай народна-вызваленчай паўстанцкай арміі да воінаў Савецкай Арміі: «Мы вас чакаем, браты-чырвонаармейцы! У сэрцах нашых гучаць усе салюты вашых перамог. І чакаем вас не са складзенымі рукамі... Ваша блізкасць і наша воля да барацьбы пры падтрымцы народа з'яўляюцца гарантыяй, што Балгарыя будзе свабоднай, незалежнай і дэмакратычнай».

Па свайму характару і маштабу Вялікая Айчынная вайна была ўсенароднай. Фронт і тыл зліваліся ў адзінае цэлае. Па сутнасці, наш народ стаў змагаром, які ўсе свае сілы і сродкі аддаваў дасягненню перамогі.

Важнейшай асаблівасцю Вялікай Айчыннай вайны быў нябачны ў гісторыі патрыятызм і масавы гераізм савецкага народа. Пачуццё адзінай Айчыны было невычэрпнай крыніцай духоўных сіл савецкіх людзей, іх ратных і працоўных подзвігаў. Жыватворная сіла савецкага патрыятызму і сацыялістычнага інтэрнацыяналізму, што згуртавала ў дружную сям'ю нацыі і народнасці краіны, ва ўсёй паўнаце праявілася ў гады вайны.

Усе нацыі і народнасці нашай краіны мужна змагаліся за сваю Радзіму. І ўнеслі дастойны ўклад у дасягненне Перамогі. Гітлераўскія стратэгі меркавалі весці барацьбу толькі з арміяй, а сустрэлі супраціўленне ўсяго народа. Патрыятызм шматмільённых мас праяўляўся і ў стварэнні дабраахвот-

ных узброеных фарміраванняў, іх удзеле ў будаўніцтве абарончых збудаванняў, руху донараў.

Яркім сведчаннем усенароднага характару вайны з'яўляецца барацьба супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў на акупіраванай імі тэрыторыі. Сваёй адвагай і мужнасцю, бязмежнай адданасцю Радзіме партызаны і падпольшчыкі аказалі вялікую дапамогу воінам-франтавікам.

Бяспрыкладнай гераічнай эпапеяй увайшоў у гісторыю Вялікай Айчыннай вайны ратны подзвіг беларускага народа. Акупіраваная фашыстамі Беларусь ператварылася ў суцэльную лінію фронта, дзе ні на мінуту не спыняліся жорсткія сутычкі з ворагам. Ніякія намаганні захопнікаў не змаглі паставіць на калені яе народ. Цяжкія выпрабаванні былі пераадолены вялікай сілай духа, смеласцю і стойкасцю, агульнымі намаганнямі ўсіх працоўных СССР. Побач з беларусамі на тэрыторыі рэспублікі змагаліся з фашыстамі прадстаўнікі звыш 70 нацыянальнасцей і народнасцей нашай краіны [1]. Усенародная барацьба, якая распачалася ў тыле ворага, была неад'емнай часткай барацьбы савецкага народа за перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне.

Абараняючы сацыялістычную Айчыну, наш народ не толькі абараняў сваю Радзіму, але і адстойваў усю сусветную цывілізацыю, надзеі народаў на сацыяльны прагрэс, на лепшую будучыню. У гэтым — вялікая заслуга савецкага народа, нашых Узброеных Сіл перад чалавецтвам.

Савецкія людзі прынялі актыўны ўдзел і ў замежным руху Супраціўлення фашызму і рэакцыі. Як і воіны Чырвонай Арміі, яны былі прыкладам для замежных барацьбітоў з фашызмам.

Перамога Савецкага Саюза над фашызмам была перамогай не толькі ваеннай. Гэта была палітычная Перамога, якая азнаменавала перамогу савецкага грамадства і дзяржаўнага ладу. У Вялікай Айчыннай вайне яшчэ больш умацавалася класавая аснова магутнасці Савецкай дзяржавы — непарушны саюз рабочага класа і сялянства. Гэта галоўная і рашаючая сіла савецкага грамадства, надзейная гарантыя яго жыццяздольнасці як у мірны, так і ў ваенны час, крыніца ўсіх перамог савецкага народа.

У вайне супраць СССР разлікі ворага на раскол саюза народаў нашай шматнацыянальнай краіны, на сутыкненне паміж імі пацярпелі поўны крах. З першых жа дзён фашысцкага нашэсця ўсе народы Савецкага Саюза ўзняліся на абарону Айчыны.

«Камуністы, наперад!» Гэты не прадугледжаны ніякім воінскім статутам заклік часта гучаў у крытычныя мінуты боя. У камуністаў была толькі адна прывілея, толькі адно права — быць на галоўным напрамку ў наступленні і на самым рашаючым участку ў абароне. Быць там, дзе цяжэй за ўсё. І ўсюды камуністы праяўлялі смеласць, мужнасць і гераізм. У барацьбе з ворагамі нашай Радзімы загінула больш 3 млн. членаў партыі. Але яе рады не слабелі. Пяць мільёнаў савецкіх патрыётаў уступілі ў партыю ў гэты цяжкі перыяд [2].

У гады вайны з усёй паўнатой праявілася ідэйна-палітычная і арганізатарская сіла ленінскай партыі, яе кіруючая роля ў абароне заваёў сацыялізму. КПСС з'явілася сапраўды партыяй-змагаром. Непарыўнымі вузамі партыя была звязана з народам.

Перамога над фашызмам была і перамогай ідэалагічнай. Калі ў суадносінах ваенных і эканамічных паказчыкаў у пачатку вайны ў гітлераўцаў і былі некаторыя часовыя перавагі, то на ідэалагічным фронце з першага ж дня Айчыннай вайны невымерная перавага знаходзілася на баку Савецкага Саюза. Мэтанакіраваная ідэалагічная работа партыі на фронце і ў тыле была тым асялком, на якім адточваліся мужнасць і адвага байцоў на палях бітваў, смеласць народных мсціўцаў, самаадданасць працаўнікоў тыла. Яна ўзброіла байцоў і камандзіраў, увесь савецкі народ самай моцнай зброяй — ідэйнай, давала веру ў свае сілы, натхняла на подзвігі ў імя свабоды і незалежнасці краіны.

Тут цікава ўспомніць артыкул з амерыканскай газеты «Нью-Йорк пост», апублікаваны ў чэрвені 1941 года, пасля таго як савецкія войскі пакінулі Мінск. «Для таго, каб чырвоныя маглі выратавацца ад катастрофы,— пісала газета,— на працягу вельмі кароткага часу павінен адбыцца значна большы цуд, чым гэта было калі-небудзь з часу напісання бібліі»[3]. Прароцтва буржуазных пісак зразумелае. У ім скрозь нявер'е ў сілу савецкага ладу. Але «цуд» адбыўся, і ім аказаўся савецкі народ, які стаў увасабленнем мужнасці і душэўнай высакароднасці, несакрушальнай волі да перамогі, цудоўным узорам выканання свайго патрыятычнага і інтэрнацыянальнага абавязку.

На баявых рубяжах уступілі ў смяротны паядынак не толькі браня і

зброя, але і салдацкая стойкасць, воінскае майстэрства, савецкі патрыятызм. Група савецкіх салдат на чале з сяржантам Я. Паўлавым 58 дзён абараняла чатырохпавярховы дом у Сталінградзе. Вораг так і не змог яго ўзяць. На асабістай карце Паулюса гэты дом быў адзначаны як крэпасць. Палонныя нямецкія разведчыкі лічылі, што яго абараняе батальён. Сімвалічна, што пасля Вялікай Айчыннай вайны сталінградцы прывезлі і замуравалі ў фундамент аднаго з узводзімых новых будынкаў у Мінску цэглу з легендарнага дома Паўлава, які стаў увасабленнем стойкасці, мужнасці і гераізма абаронцаў Волжскай цвярдыні і абаронцаў Беларусі, усіх тых, хто адстаяў нашу Радзіму ў барацьбе з фашызмам.

У мінулай вайне перамаглі не толькі таленавітасць нашых палкаводцаў, не толькі магутнасць нашай зброі, але перш за ўсё магутнасць народнага духа. І ў працаўнікоў тыла, і ў франтавікоў была адна зброя — гарачая нянавісць да ворага, бязмежная адданасць Радзіме.

Ад першых баёў на граніцы да штурма Берліна ішоў непахісна і мужна савецкі салдат да вялікай Перамогі. Вораг быў моцным, вопытным, каварным. Кожны бой, кожная бітва патрабавалі ад нашых воінаў вялікіх намаганняў — творчых, маральных, фізічных, самаахвяравання.

Так было пад Масквой, калі да яе заставалася адлегласць, роўная далёкасці стральбы цяжкай гарматы; пад Сталінградам, дзе да Волгі заставаліся сотні метраў; на Курскай дузе, калі адборныя фашысцкія войскі наносілі небяспечныя ўдары з поўначы і поўдня; на Дняпры, дзе нямецкае камандаванне будавала «усходні вал» і Гебельс вяшчаў, што Германія будзе весці, калі спатрэбіцца, і «сямігадовую», і «трыццацігадовую вайну»; таксама цяжка было ва Усходняй Прусіі, якая стагоддзямі рыхтавалася як плацдарм агрэсіі на ўсход.

Калі гітлераўцы ішлі на Маскву, у іх распаленым уяўленні зарадзіліся фанатычныя планы знішчэння савецкай сталіцы, яе насельніцтва. Гітлер двойчы аддаваў загады не прымаць капітуляцыі Масквы, хоць ніхто яму такой капітуляцыі не прапаноўваў. Ён меў намер акружыць яе і (невядома як) затапіць вадой, каб знікла нават памяць пра яе.

З гэтым фашысты ў 1941 годзе ішлі на Маскву. У 1945-м, калі ў Берліне яшчэ працягваліся баі, з Масквы прыбылі туды прадстаўнікі Дзяржкамітэта абароны, каб тэрмінова ўпарадкаваць становішча ў горадзе, забяспечыць харчаванне насельніцтва і ў першую чаргу дзяцей. І ў той час, калі дзеці Берліна ўсё больш смела ішлі да савецкіх воінаў за ядой, у гэты самы час жонка новаяўленага рэйхсканцлера Магда Гебельс забівала сваіх шасцярых дзяцей ядам. Так яшчэ глыбей раскрылася злосная сутнасць фашызму. Забіваючы дзяцей, Магда Гебельс увасабляла чалавеканенавісніцкую ідэю Гітлера, па якой нямецкі народ, які не забяспечыў перамогу фюрэра, не павінен перажыць яго. Смяротны фарс, разыграны ў падземным бункеры, быў не выпадковым: так, апасаючыся пакарання за злачынствы, забіваюць і самі ідуць на смерць забойцы, спрабуючы ўцягнуць за сабой свае і чужыя народы.

Перамога над фашызмам была перамогай і ў дыпламатыі. Умовы, у якіх праводзілася наша знешняя палітыка, характарызаваліся тым, што ўпершыню ў гісторыі Краіна Саветаў выступала супраць агрэсіі ў саюзе з буржуазнымі дзяржавамі. Савецкай дыпламатыі прыходзілася знаходзіць і выпрацоўваць формы і прынцыпы супрацоўніцтва з тымі, хто да гэтага звычайна выступаў у якасці нашага яўнага або тайнага праціўніка.

Год 45-годдзя Перамогі — добры напамінак аб тым, як супрацоўнічалі ЗША, Англія і СССР у выратаванні міру ад фашызму. Перагаворы ўдзельнікаў антыгітлераўскай кааліцыі ніколі не былі лёгкімі, але пагадненняў дасягнуць удавалася. Набыты ў час другой сусветнай вайны вопыт супрацоўніцтва краін з рознымі сацыяльна-палітычнымі сістэмамі, вопыт агульнай антыфашысцкай барацьбы народаў у процістаянні цемрашальству і насіллю даказаў, што любая пагроза жыццю і спакою чалавецтва можа быць пераможана гэтым адзінствам.

Перамога над фашызмам аказала глыбокае ўздзеянне на ўвесь далейшы ход сусветнага развіцця. Галоўны сацыяльна-палітычны вынік вайны: аслабленне сусветнага імперыялізма як грамадскай сістэмы і ўмацаванне пазіцый сацыялізма.

Паражэнне фашызму садзейнічала новаму ўздыму і паглыбленню рэвалюцыйнага працэсу. Яно стварыла дабратворныя перадумовы для сацыялістычных, народна-дэмакратычных і нацыянальна-вызваленчых рэвалюцый, якія ахапілі цэлыя групы краін на розных кантынентах. У выніку перамогі сацыялістычных рэвалюцый у радзе краін Еўропы і Азіі ўзнікла сусветная

сацыялістычная сістэма, пачаўся бурны рост нацыянальна-вызваленчай барацьбы, які прывёў да крушэння сістэмы каланіялізму, ліквідацыі каланіяльных імперый і стварэння самастойных дзяржаў.

[1] Чырвоная змена. 1979. 9 мая.
[2] Формирование коммунистической убежденности: из опыта работы кафедр истории КПСС вузов Белоруссии. Минск, 1984. С. 205.
[3] Там жа. С. 211—212.

Э. Я. ГЕРАСІМОВІЧ

## ПАРТЫЙНЫ ЎПЛЫЎ НА РАЗВІЦЦЁ І ЎМАЦАВАННЕ ПРАФСАЮЗНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ У КАЛГАСАХ І САЎГАСАХ БЕЛАРУСКАЙ ССР (1976—1985)

Даследаванне і абагульненне вопыту, набытага сельскімі прафсаюзамі, мае важнае тэарэтычнае і практычнае значэнне ў вырашэнні праблем, што накапіліся за дзесяцігоддзі ў развіцці нашай вёскі. Праблем сапраўды ў сельскай гаспадарцы нямала, але ёсць і пэўная аснова для іх вырашэння. Гэта набыты працамі і памылкамі вопыт сацыялістычнай перабудовы вёскі, у якой адлюстраваны шматгадовая і карпатлівая праца беларускага народа і кіраўніцтва рэспублікі. У гэтым плане значную цікавасць уяўляе дзейнасць Кампартыі Беларусі ў 1976—1985 гадах.

Як вядома, адной з умоў паспяховай дзейнасці прафсаюзаў з'яўляецца іх масавасць. У. І. Ленін падкрэсліваў, што пры Савецкай уладзе развіццё прафчленства «...павінна быць даведзена да аб'яднання пагалоўна ўсіх працоўных у зладжаныя, цэнтралізаваныя, дысцыплінаваныя вытворчыя саюзы»[1].

Да 1976 года ў саўгасах Беларусі, як і ў цэлым у краіне, членамі прафсаюза былі ўсе, хто працаваў на пастаянных работах, а ў калгасах — толькі механізатары і спецыялісты сельскай гаспадаркі. Цяжка ўявіць справядлівасць таго, што паляводы і жывёлаводы ў калгасах не мелі арганізацыі, якая б прадстаўляла і абараняла іх інтарэсы.

У адпаведнасці з рэкамендацыямі XXV з'езда КПСС і рашэннем XI пленума ВЦСПС (верасень 1976 года) «Аб павелічэнні масавасці прафсаюзных арганізацый калгасаў» пачаўся прыём у члены прафсаюза ўсіх жадаючых калгаснікаў[2]. У даследуемы перыяд партыйныя арганізацыі рэспублікі значна ўзмацнілі ўвагу да дзейнасці прафсаюзаў, сталі праяўляць больш клопатаў аб іх арганізацыйным умацаванні, аб павышэнні іх ролі ў гаспадарчым і сацыяльна-культурным будаўніцтве, у выхаванні людзей. Звязаныя з гэтым пытанні неаднаразова разглядаліся ў Бюро ЦК КПБ, яны былі прадметам абмеркавання на XXI пленуме Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі (12 сакавіка 1980 года), на пленумах Мінскага, Брэсцкага і Гродзенскага абкомаў, многіх гаркомаў і райкомаў партыі. Пытанні прафчленства былі прадметам неаслабнай увагі прэзідыума, сакратарыята Белсаўпрофа, рэспубліканскага і абласных камітэтаў прафсаюза рабочых і служачых сельскай гаспадаркі і нарыхтовак.

Вялікая арганізатарская і растлумачальная работа дазволіла завяршыць прыём у прафсаюзы ўсіх жадаючых калгаснікаў у асноўным за два гады. У выніку беларускія прафсаюзныя арганізацыі сельскагаспадарчага профілю ўмацаваліся арганізацыйна, у іх адбыліся якасныя і колькасныя змяненні. Напрыклад, калі на 1 студзеня 1976 года ў 354 пярвічных прафсаюзных арганізацыях калгасаў Гродзенскай вобласці было 29 580 членаў прафсаюза, або па 83 чалавекі ў сярэднім на гаспадарку, то на 1 жніўня 1978 года 257 прафсаюзных арганізацый аб'ядналі 111 600 членаў прафсаюза, або 82,4 % усіх працаздольных калгаснікаў[3]. У гэты ж час больш за 100 тыс. працаўнікоў калгасаў было прынята ў члены прафсаюзаў у Брэсцкай вобласці[4].

Аднак не ўсюды гэта работа праводзілася энергічна і мэтанакіравана. Напрыклад, у Нясвіжскім раёне да 1979 года з 11 тыс. калгаснікаў было прынята ў прафсаюз толькі 4,5 тыс., або 40,7 %. Аналагічнае становішча склалася ў Старадарожскім, Барысаўскім і некаторых іншых раёнах Беларусі[5].

Работа па павелічэнню колькасці прафсаюзных арганізацый калгасаў не